истории (А. Гитлер, А. Македонский), вузовского преподавателя (ответ юноши) или своего отца (ответ девушки). Идеал чаще всего концентрируется на историческом отрезке времени, человек формирует его на основе памяти и стремится к ее возобновлению в настоящем через прошлое.

На основании обобщения студенческого анкетирования 2008 г. сделаем основные выводы об особенностях социализации студенчества в 1990–2010-х гг.

Студенчество ориентировалось в большой степени на прошлое, что позволяет говорить о разнообразии их взглядов и в то же время о пассивной позиции иждивенцев.

Молодежь с устойчивой мировоззренческой позицией более осознанно воспринимает действительность, обладает стройной системой ценностей.

Студенты стремятся к получению высокого и быстрого дохода, успеха без преград и трудностей.

В дальнейшем анкетирование студентов будет продолжаться, что позволит уделить внимание сравнительной характеристике предыдущего и последующих опросов, посвященных приоритетным ценностным ориентациям студенчества и их социализации.

---

1. *Гутько, О. Л.* Студенческая субкультура Беларуси как отражение трансформации общества : дис. … канд. культурологи : 24.00.01 / О. Л. Гутько. – Минск, 2009. – 135 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ БАЛЬНЫХ ТРАДЫЦЫЙ У БЕЛАРУСІ ў канцы XVIII – пачатку XX ст.

***І. В. Давыдзенка,***
*аспірант Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

Заходнееўрапейскія традыцыі мелі важны ўплыў на фарміраванне культуры і быту беларуска-польскай шляхты і магнатаў. Не выключэннем становіцца запазычванне бальнай культуры з еўрапейскіх двароў. Першыя прадпасылкі бальнай культуры адносяцца да XIII ст., што звязана з танцавальным вечарам пасля каранацыі Міндоўга. З цягам часу ў Беларусі маг-

нацкі баль трансфарміруецца, у яго уключаюцца мясцовыя традыцыі. Баль, у адрозненне ад іншых танцавальных імпрэзаў, з'яўляўся рытуалізаванай дзеяй. У ім, як правіла, удзельнічалі людзі адной сацыяльнай групы. Трэба адзначыць, што на тэрыторыі Беларусі не было зафіксавана публічных баляў, і тым самым можна зрабіць выснову на конт ізаляванасці балю ў Рэчы Паспалітай. Ізаляванасць праяўляеца ў тым, што на гэтых вечарах бавілі свой вольны час толькі прадстаўнікі вышэйшага саслоўя. Аднак на пачатку XIX ст. бачны некаторыя змены. Адам Міцкевіч пісаў:

Бо на замкавага двара вялізарным абшары
Пасталі госці, пазбіраўшыся ўжо ў пары.
«Давайце паланэз!» – чуваць навокал словы.
Прыводзяць афіцэры свой аркестр вайсковы,
Але Суддзя звярнуўся тут да генерала:
«Скажыце, каб капэлія крыху счакала,
Сягоння ж, знаеце, заручыны спраўляем,
А ў родзе нашым, страдаўнейшым звычаем,
У гэты дзень вясковыя музыкі граюць.
Вось дудары, скрыпач і цымбаліст чакаюць,
Вунь бедакі нярвуюцца, той скрыпку ўзносіць,
А вось дудар паклонам і вачыма просіць» [4, с. 129].

Як бачым, ніжэйшыя саслоўі прысутнічалі на балях у якасці музыкантаў.

Асаблівым на нашых землях быў час вечароў. Балі праводзіліся ўвесь год, акрамя пастоў. Прывілеяванае грамадства не бавілася танцамі пад час пастоў. Галоўным бальным сезонам была зіма. У гэты перыяд максімальная колькасць дзён праходзіла ў закрытай прасторы, менавіта таму і баўленне часу адбывалася ў бальных залах.

Магнацкі баль у Беларусі адрозніваецца сваёй мастацкасцю. У першую чаргу гэта звязана з уключэннем у гэтую імпрэзу тэатральных, балетных і оперных пастановак. Гэта пацвярджае дыярыўш княгіні Францішкі Уршулі Радзівіл і запіс на першай тытульнай старонцы яе кнігі «Камедыі і трагедыі», дзе яна ўказвае на прыстасаванні тэатральнай пастаноўкі да дня нараджэння мужа.

У выданні «Камедыі і трагедыі» (1754) драматычнаму твору папярэднічае «Powinszowanie od Jaśnie Oświeconej Xiężney

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Jeymosci Franciszki Urszuli z J. O. Xiążąt Korybutów Wiszniowieckich Radziwiłłowej (…) w dzień trzynasty czerwca urodzenia Jaśnie oświeconego Xiążęcia Jmci Michała Kazimierza Antoniego Radziwiłła … z naturalnego affektu Dożywotniey przyjaźni temuż J. O. Solenizantowi ofiarowane» («Віншаванне ад Яснавяльможнай княгіні Яемосці Францішкі Уршулі Радзівіл з Яснавяльможных князёў Вішнявецкіх (...) 13 чэрвеня ў дзень нараджэння Яснавяльможнага Ягамосці князя Міхала Казіміра Антонія Радзівіла … з натуральнай сімпатыі і пажыццёвага сяброўства таму ж Яснавяльможнаму імяніннiку ахвяравана»). Таксама ў дзённіку Ф. У. Радзівіл адзначана, што ў гэты дзень «быў вялікі баль» [5, с. 123]. Гэта гаворыць, што для ўвесялення гасцей і ўдзельнікаў балю спецыяльна рыхтаваліся тэатральныя пастаноўкі. Такім чынам можна меркаваць, што бальная культура паўплывала на развіццё тэатральнага мастацтва Беларусі.

Адной з забаў беларускай шляхты з'яўляліся масленічныя балі-маскарады. Маскарад – месца, дзе дазваляліся паводзіны, забароненыя ў звычайных абставінах. Маска дазваляла авантурныя паводзіны ў адносінах палоў. Аб маскарадах узнікалі легенды, мемуарысты распавядалі пра містычныя здарэнні, звязаныя з маскарадам. Саслоўнымі асяродкамі баўлення вольнага часу з'яўляліся «дваранскія зборні», дзе некалькі разоў на тыдзень ладзілі балі і вечарыны. Тут гулялі ў карты, більярд, шахматы, знаёміліся з прэсай.

Тэатральнасць можна лічыць унутранай асновай маскараду. У ім задзейнічаны асноўныя элементы тэатральнага прадстаўлення: касцюм і грым, музыка і танцы, пантаміма і інш. (часта разыгрываліся сцэны і карціны з сімвалічным падтэкстам). Нярэдка для маскараду пісалі сцэнарыі і праводзілі рэпетыцыі маскараднага шэсця. Так, сцэнарыст маскараду ў Шклове ў гонар прыезду Кацярыны II у 1780 г. уключаў спектакль і феерверк, які рыхтавалі некалькі месяцаў. Такія маскарады маглі доўжыцца некалькі дзён, часам тыдзень, пры гэтым кожны дзень меў сваю праграму. Камерныя палацавыя маскарады адрозніваліся вытанчанасцю мастацкай задумы, абавязковай іх часткай былі тэатральныя пастаноўкі, балет, жывыя карціны. Маскарады ў Г. Ф. Радзівіла абавязкова ўключалі выступленні капэлы і балета «ў масках», а таксама тэатра марыянетак [4, с. 28].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Трэба адзначыць, што маска і маскарадны касцюм з'яўляюцца адным з самых абавязковых і ўстойлівых элементаў маскараду. Без касцюма нельга ўключацца ў маскарадную гульню. Кожная маска прадугледжвае пэўны падтэкст, дыктуе стыль паводзін. Для неабходнага асэнсавання маскі важна, каб яе сімвалічны падтэкст быў вядомы навакольным, інакш маска губляе сэнс. На працягу дзесяцігоддзяў маскарадныя касцюмы змяняліся мала, за выключэннем прыхільнасцяў арганізатараў маскараду або ўплываў моды [3, с. 151–152].

Даследчыкам Г. І. Барышавым засведчана, што пры палацах і замках беларускіх магнатаў уладкоўваліся адмысловыя «крамы» (склады маскарадных касцюмаў). Такі склад у «кафейным доме» Слоніма, па вопісу 1796 г., налічваў некалькі сотняў «розных касцюмаў арлекінаў і іншыя штукі для мужчын і дам» [1, с. 94].

Маскарадная прастора ў выглядзе спецыяльна афармленага памяшкання з'яўляецца адным з патрабаванняў для правядзення маскараду. Залы дзяліліся на прызначаныя для танцаў, спектакляў, жывых карцін, вячэры і проста забаў. Яны заўсёды афармляліся ў адпаведнасці з тэматыкай маскараду, стылем тэатральных паказаў. Удзельнікі свята маглі свабодна выбраць маскарадныя пляцоўкі па сваім меркаванні, прыехаць або з'ехаць у любы час. Летам для маскараду адводзіліся не толькі ўнутраныя памяшканні, але і сады, паркі, вадаёмы, якія ўпрыгожваліся адпаведным чынам. Стыль ўпрыгожвання парку таксама шмат у чым вызначаў і касцюмы ўдзельнікаў.

Баль з'яўляўся месцам разнастайных камунікацый – ад любоўных да грамадска-палітычных. Тут упершыню выяўляліся і замацоўваліся модныя тэндэнцыі. Грамадскія балі і вечары часам ладзіліся ў гонар асобных людзей ці з нагоды пэўных падзей. Па сведчанні мемуарыстаў, напярэдадні вайны з Напалеонам «шал забаваў» на беларускіх землях ахапіў рэзідэнцыі магнатаў, двары, нават дворыкі. Балі, што ладзіліся для каранаваных асоб, узніма́ліся да вышынь мастацтваў. Прыкладам могуць служыць імпрэзы, якія адбываліся ў Вільні на працягу 1812 г. у гонар расійскага і французскага імператараў [7, с. 121].

Асаблівасцю правядзення баляў у Беларусі былі конныя каруселі. Каруселі – конныя спаборніцтвы, якія ўключалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стральбу на кані, паказ майстэрства валодання пікай і шабляй, вальтыжыроўку. На спецыяльных «карусельных» пляцах было «карэ», у сярэдзіне квадрата былі прыстасаваны розныя перашкоды (кольцы, бар'еры, фігуры са зброяю і г. д.), далей размяшчаліся чатыры групы вершнікаў («банды» або «кадрылі»), апранутыя ў розныя касцюмы, яны пачыналі спаборніцтвы. Часам «каруселі» дэкарыраваліся, упрыгожваліся атрыбутамі рыцарскіх сярэднявечных турніраў. Яны мелі прываблыя відовішчныя формы і вызначаліся фантазіяй і вынаходлівасцю. У сваім дзённіку Міхаіл Казімір Радзівіл узгадвае, як выглядалі перашкоды на пляцы [2, с. 35]. Гэта былі драўляныя статуі, апранутыя ў адзенне арлекінаў, кожная з якіх мела свой спосаб перашкоды. Першая трымала ў адной руцэ круг, у другой – «кій скураны, саломай напханы». Трэба было вельмі моцна ўдарыць па крузе і хутка адбегчы, таму што рукі ў лялькі перакручваліся і кій біў гуляючага па галаве. Другая скульптура на грудзях мела жалезны круг, у цэнтр якога трэба было папасці «глінянай куляй». Калі трапляеш, то вылятае ракета ўверх, а калі міма – «мільён шмэрмэляў» (феерверкаў) вылятала пад ногі чалавека. Трэцяя лялька мела дзве скрынкі, калі трапіш добра – вылятаюць з яе птушкі, а калі трапіў не ў тую, «дык уцякай ад таго, што ў той скрынцы». Чацвёртая статуя мела на грудзях кружок, у які трэба было трапіць лапаткай. Калі пападаеш, то з «губы» лялькі выліваецца вядро вады, і задача гуляючага не толькі папасці, а і своечасова адскочыць [2, с. 36].

Яшчэ адной асаблівасцю бальнай культуры ў Беларусі з'яўляецца пераймане традыцыі ў магнацкіх асоб больш нізкімі сацыяльнымі группамі. Такім чынам, праводзяцца адкрытыя дабрачынныя і грамадскія балі, дзе кожны жадаючы (з улікам дрэскоду і пры наяўнасць ўхаднога квітка) мог удзельнічаць у гэтым танцавальным вечары. Прыкладам з'яўляюцца грамадскія балі яўрэйскага аб'яднання «TOZ» (з польск. «ТАЗ» – таварыства аховы здароўя [8, с. 263]). Сёння на сайце цыфравога архіва яўрэйскага жыцця ў Польшчы можна знайсці дзве афішы з запрашэннем на дабрачынныя балі «Вялікі баль» і «Першы дабрачынны баль». Афіша была прадстаўлена на польскай і яўрэйскай мовах і ўключала ў сябе наступную інфармацыю: «У суботу, 19 ліпеня 1930 года, у дарагім рэстаране "ОАЗА" на вуліцы Віленскай, 19 адбудзецца "Першы вялікі дабрачынны

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

баль”. Увесь прыбытак пойдзе на таварыства “ТАЗ” у Гродна. Квіткі можна набыць у рэстаране “ОАЗА” і ў краме Нёманскага завада». Другая афіша мела падобную інфармацыю, але сродкі прызначаліся яўрэйскаму шпіталю. Дадзеныя афішы адрасуюць нас да таго, што ў пачатку ХХ ст. у Заходняй Беларусі традыцыі магнацкага балявання не страчваюць сваё існаванне, а працягваюцца ў грамадскіх і дабрачынных балях.

Яшчэ адным фактам існавання бальнай культуры пасля 1917 г. з’яўляецца запрашэнне на касцюміраваны баль у Нясвіжы ў 1935 г. На ім было ўказана, што вечар адбудзецца ў гімназіі ім. У. Сыракомлі пад аркестр сп. Саламонава. Касцюміраваны баль таксама меў сваю назву – «На вуліцах Нью-Ёрка». Гэта значыць, што такі баль меў сваю спецыфіку касцюміравання і пэўны дрэс-код.

Бальныя традыцыі ў Беларусі існуюць з даўніх часоў і маюць своеасаблівасці, якія робяць яго ўнікальнай з’явай у мастацтве. Баль у Беларусі ўключае ў сябе такія кампаненты, як народная музыка, спецыяльныя элементы касцюма, наяўнасць на танцавальных імпрэзах разнастайных забаў і элементаў мастацкай культуры (паказы опер, драматычных твораў, балетных спектакляў). Галоўным адрозненнем на Беларусі ад агульнаеўрапейскай традыцыі ўзнікнення балю з’яўляецца тое, што ён пераняты з заходнееўрапейскіх магнацкіх сустрэч, а не перанесены з гарадской культуры. Але менавіта магнацкі баль даў падставу для арганізацыі гарадскіх, грамадскіх і дабрачынных баляў у пачатку ХХ ст.

1. *Барышев, Г. И.* Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г. И. Барышев ; ред. О. Ф. Нечай ; Союз театр. деятелей Респ. Беларусь. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 290 с.

2. Дыярыюш князя Міхаіла Каземіра Радзівіла Ваяводы Віленскага Гетмана Вялікага княства Літоўскага // Спадчына. – 1994. – № 4. – С. 34–40.

3. *Миланич, Е. Э.* Специфика маскарадного празднества в дворцовой художественной культуре России и Беларуси второй половины XVIII–XIX вв. / Е. Э. Миланич // Культура: открытый формат – 2012: (библиотековедение, библиографоведение и книговедение, искусствоведение, культурология, музееведение, социокультурная деятельность) : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т культуры и искусств ; сост.: Т. Н. Бабич, Ю. А. Переверзева, Е. Н. Шаройко ; науч. ред. М. А. Можейко. – Минск, 2012. – С. 151–155.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. *Міцкевіч, А.* Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве : шляхецкая гісторыя 1811–1812 гадоў : у 12 кн. / А. Міцкевіч ; пад рэд. У. Казберука ; перакл. Я. Семяжона. – Мінск : Маст. літ., 1985. – 399 с.
5. *Русецкая, Н.* Сямейная муза: паэзія Францішкі Уршулі Радзівіл / Н. Русецкая. – Мінск : Кнігазбор, 2006. – 212 с.
6. *Скеп'ян, А. А.* Касцюміраваныя забавы ў ВКЛ у XVI–XVII стагоддзях / А. А. Скеп'ян // Беларускі гістарычны часопіс. – 2012. – № 6. – С. 25–32.
7. *Шыдлоўскі, С. А.* Культура прывілеяванага саслоўя Беларусі: 1795–1864 гг. / С. А. Шыдлоўскі ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтв., этнаграфіі і фалькл. імя К. Крапівы. – Мінск : Беларус. навука, 2011. – 167 с.
8. *Щука, О. Л.* Общественно-политическая жизнь еврейского населения в Гродно в межвоенный период / О. Л. Щука // Грамадскія рухі і палітычныя партыі ў Беларусі (апошняя чвэрць XIX – пачатак XXI ст.: рэспубл. науч. конф. – Гродно, 2009. – С. 262–266.

# МІЖКУЛЬТУРНЫЯ КАНТАКТЫ ЯК ФАКТАР РАЗВІЦЦЯ МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ Ў XIX ст.

***В. У. Дадзіёмава,***
*доктар мастацтвазнаўства,*
*прафесар кафедры гісторыі музыкі і музыкальнай беларусістыкі*
*Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі*

Праблемы міжкультурных сувязяў маюць прынцыповае значэнне для вывучэння айчыннага мастацкага, у тым ліку і музычнага. Гэта натуральна, паколькі беларускія землі, што знаходзяцца ў цэнтры славянскай і еўрапейскай прасторы, спрадвеку былі шчыльна звязаны ў сваім культурным жыцці з шырокім мастацкім асяроддзем. Гэтаксама і айчыннае музычнае мастацтва XIX ст. заставалася неаддзельным складальнікам вялікага музычнага абшару.

У той час, у эпоху рамантызму, калі Беларусь існавала ў дзяржаўных межах Расійскай Імперыі, найбольш інтэнсіўны характар павінна было б набыць узаемадзеянне з рускай культурай. Аднак уся першая палова XIX ст. адзначана на Беларусі ўзмацненнем заходняга прыцягнення. Адной з яго праяў стаў адток з нашага краю на захад многіх таленавітых музыкантаў. Сярод іх Н. Орда, Ф. Міладоўскі, А. Радзівіл, М. Ельскі, С. Ма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ